***Бянько А. А.***

## УЗ'ЯДНАННЕ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ З БЕЛАРУСКАЙ ССР

*Бянько Антон Андрэевіч, студэнт 2 курса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, г. Мінск, Беларусь, twiniss2000@gmail.com.*
*Навуковы кіраўнік: д-р юрыд. навук, прафесар Доўнар Т. І.*

У ходзе напружанай палітычнай абстаноўкі 1918–1920 гг. тэрыторыя Беларусі была падзелена на заходнюю і ўсходнюю, якія значна адрозніваліся адна ад другой ва ўсіх сферах грамадскага ладу.

Ні ў адным з міжнародных дагавораў, заключаных Польшчай, заходнія беларускія землі не разглядаліся як асобная геаграфічная ці адміністрацыйная адзінка, адрозная ад іншай тэрыторыі Польшчы, якой павінны быць нададзены пэўныя правы.

Існуе праблема, ці можна ўвогуле гаварыць у другой палове 1920 г. пра суб'ектнасць Беларусі і якой Беларусі – той, якую прадстаўляла ССРБ, створаная расійскімі бальшавікамі ў студзені 1919 г. і адноўленая ў ліпені 1920 г., ці той, якую ўвасаблялі канкурыруючыя паміж сабой антыбальшавіцкія Найвышэйшая Рада БНР і Народная Рада БНР.

На тэрыторыі Заходняй Беларусі ў перыяд знаходжання яе ў складзе Польшчы фактычна быў усталяваны ваенна-паліцэйскі рэжым, які ажыццяўляўся з дапамогай мясцовага дзяржаўнага апарата. Мясцовымі органамі дзяржаўнай адміністрацыі ў кожным ваяводстве з'яўляліся ваявода і ваяводскае ўпраўленне. Пры ваяводзе існавала ваяводскае ўпраўленне, якое складалася з аддзелаў: агульнага, бяспекі, самакіравання, адміністрацыйнага, ваеннага, земляробства, прамысловасці, аховы здароўя, працы і інш.

Паступова палітычны рэжым у Польшчы набываў рысы таталітарнага, аб чым сведчыла заканадаўства. Шэраг заканадаўчых актаў пашыралі паўнамоцтвы мясцовай адміністрацыі, паліцыі, судова-следчага апарата ў барацьбе з нацыянальным рухам на беларускіх землях. Аб такім накірунку развіцця польскай дзяржавы сведчыла і новая Канстытуцыя Польшчы, якая змяніла кампетэнцыю і парадак фарміравання цэнтральных органаў улады.

Беларуская мова паступова выкаранялася з выкарыстання не толькі дзяржаўнымі органамі, але і органамі самакіравання, а таксама з адукацыйных устаноў. Беларусы выціскаліся з палітычнага жыцця. Мэтанакіраваная палітыка дыскрымінацыі і паланізацыі беларускага насельніцтва прывяла да таго, што ў 1939 г. у Заходняй Беларусі на 4 млн. беларусаў не было ні адной беларускай сярэдняй школы, вышэйшай навучальнай установы, нацыянальнага тэатра, бібліятэкі і г. д. Беларускія газеты зачыняліся пасля выхаду некалькіх нумароў.

Летам 1939 г. пачаўся працэс рэзкай змены геапалітычнай сітуацыі ў Еўропе. 23 жніўня 1939 г. урад СССР заключыў дамову з Германіяй, падпісаўшы пакт аб ненападзе, дапоўнены сакрэтнымі пратаколамі, якія падзялялі сферы ўплыву Германіі і Савецкага Саюза (пакт Молатава–Рыбентропа). У сакрэтных пратаколах адзначалася, што ў выпадку тэрытарыяльна-палітычнага пераўладкавання абласцей, якія ўваходзілі ў склад прыбалтыйскіх дзяржаў (Фінляндыі, Эстоніі, Латвіі, Літвы), паўночная мяжа Літвы адначасова з’яўляецца граніцай сфер інтарэсаў Германіі і СССР. Пры гэтым інтарэсы Літвы адносна Віленскай вобласці прызнаюцца абодвума бакамі. Дагавор быў ратыфікаваны Вярхоўным Саветам СССР 31 жніўня 1939 г. 1 верасня 1939 г. Германія пачала вайну супраць Польшчы.

У цэлым змены на тэрыторыі заходніх раёнаў БССР носяць супярэчлівы характар. З аднаго боку, канфіскавалася вялікая колькасць польскіх зямель на карысць беларускім сялянам, адбывалася беларусізацыя сістэмы народнай адукацыі і дзяржаўных устаноў. Але з другога боку, праходзіла нацыяналізацыя зямлі і прамысловасці, сельскай гаспадаркі. Аднак самае галоўнае – уз’яднанне беларускага народу ў адзінай дзяржаве стала найбуйнейшай гістарычнай падзеяй у перадваенны час. Гэтыя падзеі, якія можна назваць усталяваннем гістарычнай справядлівасці, садзейнічалі тэрытарыяльнай і этнічнай кансалідацыі беларускага народа – неабходнага падмурку беларускай дзяржаўнасці.

***Калишук В. О.***

## МЕДИАКОММУНИКАЦИЯ НА БАЗЕ СОЦИАЛЬНЫХ МЕДИА КАК ОДНО ИЗ НАПРАВЛЕНИЙ ОБЕСПЕЧЕНИЯ ИНФОРМАЦИОННОЙ БЕЗОПАСНОСТИ

*Калишук Владислав Олегович, студент магистратуры Белорусского государственного университета, г. Минск, Беларусь, rristar@mail.ru*
*Научный руководитель: канд. полит. наук, доцент Побережная О. Е.*

Наряду с очевидными положительными тенденциями, возникающими в результате повсеместного внедрения информационных технологий в различные сферы жизни общества, государства и человека, возникает ряд негативных эффектов информатизации и медиатизации: по всему миру наблюдается рост количества киберпреступлений и сопутствующего им ущерба (по данным Cybersecurity Ventures, кибератаки по миру происходят каждые 14 секунд, а ущерб от киберпреступлений на 2017 г., по данным отдела аналитики McAfee, составил 600–650 млрд. долл.), происходят регулярные утечки персональных данных (По сведениям InfoWatch, со 198 случаев утечки в 2006 г. до 2263 в 2018 г., появляется угроза кибертерроризма). В связи с этим возникает необходимость в обеспечении информационной безопасности общества и государства. Особенно это актуально для реалий Республики Беларусь, так как в стране взят курс на инновационное развитие, а население активно пользуется